# Адам Русак

(1904—1987)



*Адам Герасімавіч Русак нарадзіўся*
*24 мая 1904 года ў в. Пясочнае*
*(зараз Капыльскі раён Мінскай вобласці)*





# Вучоба

У 1914 г. Адам Русак скончыў Пясочанскую пачатковую школу.

У 1922 г. паступіў у Мінскі будаўнічы тэхнікум.

Тэхнік з яго не выйшаў. Ён больш хадзіў па тэатрах і рэстаранах, каб паслухаць музыку, чым сядзеў над чарцяжамі.
У хуткім часе пакінуў вучобу.

# Вучоба

*У 1925–1930 гг. Вучыўся ў Мінскім музычным тэхнікуме, іграў у сімфанічным аркестры Беларускага радыё і адначасова служыў музыкантам у Чырвонай Арміі.*





# Вучоба

*У 1930–1934 вучыўся ў Ленінградскай кансерваторыі па класу скрыпкі і валторны.*







# Работа

З 1932 года і пасля заканчэння кансерваторыі працаваў салістам аркестра Ленінградскага Малога акадэмічнага тэатра оперы і балета.





# Работа

У 1942–1944 гг. разам з тэатрам эвакуіраваны ў Арэнбург.
З 1949 г. – пенсіянер рэспубліканскага значэння.






# Узнагароды

*Адам Русак узнагароджаны ордэнамі Дружбы народаў, Знак пашаны, медалямі і Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета Беларусі*









# Ушанаванне памяці

У в. Пясочнае і ў Копыле імем А. Русака названа вуліца, там яму ўстаноўлена мемарыяльная дошка.
Таксама на радзіме паэта у в. Пясочнае адкрыты музей.





# Выдавецкая дзейнасць

Першы верш Адама Русака “Мая песня” апублікаваны 27 мая 1927 года ў часопісе “Чырвоны сейбіт”.

Больш рэгулярна пачаў друкавацца з 1932 года (у часопісах “Полымя рэвалюцыі”, газетах “Звязда”, ”Літаратура і мастацтва”).



# Творчасць

У пачатку творчага шляху А. Русак
не ставіў за мэту пісаць песні,
але кампазітары самі звярталі ўвагу
на яго вершы, ствараючы да іх музыку.
Паступова ён стаў прафесійным
паэтам-песеннікам.



# Творчасць

Першы верш Адама Русака
“Мая песня” апублікаваны 27 мая 1927 года ў часопісе “Чырвоны сейбіт”.

# Творчасць

У 1940 годзе быў падрыхтаваны да друку першы яго зборнік “На родных палетках”, але вайна перашкодзіла яго своечасоваму выданню.
Ён быў выдадзены толькі ў 1946 годзе.

# Творчасць

Адам Русак – аўтар зборнікаў паэзіі “Песні і вершы”, “Песні” (на рускай мове), “Пад голас баяна”, “Толькі з табою”, “Звонкія крыніцы”, “Закрасуйся, Нёман”, “Песні на словы А. Русака”, “Засцілайце сталы”, “Песні радасці” і інш.







# Фотаархіў



*Адам Русак. Ленінградскі перыяд.*





Адам Русак (злева) з групай сельскіх музыкаў.



*Герасім Русак — бацька паэта (злева), Сямён Русак — дзед у вёсцы Пясочнае.*





*Саліст Белдзяржфілармоніі Адам Русак з'язджае на гастролі. Пад пахай у чахле - валторна*




*Жонка Адама Русака - Марыя Яўгенаўна - была малодшай яго на 19 гадоў*




*Адам Русак, 1970-я гады. Вышыўка на кашулі зроблена яго жонкай Марыяй Яўгенаўнай*

*Няхай песня Адама Русака застаецца*
*ў памяці і ў вашых сэрцах.*
*Гэта будзе самая найлепшая ўзнагарода*
*для сапраўднага паэта!*

# *Да новых сустрэч!*